# *Ваўкавышчына*

Краязнаўчы часопіс

№ 4 2007 г.



# *Змест часопіса*

1. Аляксей Шаланда. Сапраўдны гербоўнік шляхты Ваўкавыскага павета ВКЛ у 16-18 ст. 1
2. Мікалай Быхаўцаў. Гадавая справаздача па гораду Ваўкавыску за 1845 год........................8
3. Николай Быховцев. Постановления волковысской городской Думы за 1891 год..............12
4. Вітальд Карпыза. Воўпа.....................................................................................................20
5. Воўпа ў датах 15-16 ст. ст.................................................................................................24
6. Вітальд Карпыза. Дзіцячыя гады на роднай зямлі.......................................................... 25
7. Николай Быховцев. Волковыск межвоенный: торговля..................................................32
8. Николай Быховцев. Семь суток войны.............................................................................45
9. Кніга Валыняка "З мінулага Ваўкавыскага павета" ........................................................59
10.Узвядзенне крыжа ў Ваўкавыску.......................................................................................60

Рэдактар Мікалай Быхаўцаў
Надрукавана на абсталяванні сяброў
Наклад 200 паасобнікаў

Распаўсюджваецца бясплатна на правах унутранай дакумэнтацыі грамадскай арганізацыі, якая спрычынілась дзеля яго выдання: Ваўкавыскай раенай арганізацыі ТБМ (Таварыства беларускай мовы) імя Ф. Скарыны.

Аўтары цалкам нясуць адказнасць за дакладнасць сваіх матэрыялаў. Пры перадруку артыкулаў альбо іх часткі спасылка на часопіс і аўтара артыкула абавязкова.

Адрас для кантактаў:
Ваўкавыск-231900, п/с № 38, Быхаўцаву Мікалаю.
Электронны адрас: byhaucau@tut.by

На першай старонцы вокладкі вуліца Шырокая ў 1938 г. (сучасная Леніна) Знішчана ў пачатку вайны 1941 г. Малюнак Аляксандра Папова

# Сапраўдны гербоўнік шляхты Ваўкавыскага павета ВКЛ у XVI–XVIII ст.

***Аляксей Шаланда***

Працяг. Пачатак у № 1-3.



**(23). Бака Іван**, шляхціч Ваўкавыскага павета, 1573.

**Герб**: на картушовай тарчы клейнавы знак у выглядзе доўгага простага крыжа з разшчэпленымі на тры промні канцамі, раздзёртага ў крокву, канцы якой заламаныя па разу ўверх і ўніз, пад знакам два ўрубы, над тарчай гелм без кароны, у кляйноце два рогі з пяром паміж імі, вакол тарчы намёт, па баках кляйнота ініцыялы: "*I[wan] B[aka]*".

Пячатка: адб.№2, нак, 14х16 мм, в [9, ф.1664, воп.1, спр.604, а.3].

10 сакавіка 1573 г. у Свіслачы Іван Бака, як сведка і пячатар прыклаў сваю пячатку да застаўнага ліста ***Яна Хадкевіча***, графа на Шклове і Мышы, старосты жамойцкага, найвысшага маршалка ВКЛ, адміністратара і гетмана Інфлянцкай зямлі, старосты ковенскага і дзяржаўцы платэльскага і цяльшоўскага.

Род Бакаў паходзіў са Смаленскай зямлі або, паводле В.Каяловіча, "*з Северичыны*" [3, s.171]. У Ваўкавыскім павеце з'явіліся ў першай палове XVI ст. – у 1520 г. намеснікам ваўкавыскім старосты Яна Глябовіча быў Астафі Матвеявіч Бака [27, Т.1, s.82]. Па попісу войска ВКЛ 1528 г. сярод ваўкавыскіх баяраў 3 кані ставіў яго брат Фёдар Матвеявіч Бака [16, с.96]. У 1540 г. ён згадваецца як дзяржаўца магілёўскі, жонкай жа Фёдара была Таміла Андрэяўна Лазчанка [27, Т.1, s.82]. Валоданні Бакаў у Ваўкавыскім павеце падае попіс 1567 г. Паводле яго пан Грыгоры Бака, ротмістр ЯКМ валодаў Лапеніцай, Свіслаччу і Ясенавіцамі [31, с.62]. Быў гэта адзін з ротмістраў пра якіх В.Каяловіч пісаў: "*Bakowie dway rotm. KIM. za Zygmunta Augusta, mężowie dzielni y odważni*" [3, s.171].

Другім быў Іван Бака. Відаць, пра яго пісаў у сваім "*Дыярыюшы*" Фёдар Еўлашоўскі ў 1579 г.: "*...былэм при велким жалю и фрасунку у пана Ивана Баки у Осташине именю его, где му умарла малжонка Александра княжна Крошинская... Яко ж взял потом тетку ее, ктора первей была за Тугановским и Подаровским, Татьяну Скумину, далеко юж розну от тэй першэй, хоть сестреницы е, наддэр скупую, ктора до зэбраня пенезей му помогла*" [43, с.44]. В.Каяловіч называе Івана "*дзедзічам на Магільне*" [3,s.171]. І Асташын, і Магільна ляжалі ў Наваградскім павеце, аднак, знаходжанне Івана Бакі ў 1573 г. у Свіслачы можа сведчыць пра нейкія яго ўладанні ў Ваўкавыскім павеце. Негледзячы на тое што Іван быў вядомай постаццю свайго часу і нават трапіў у вершы славутага паэта ВКЛ канца XVI–пачатку XVII ст. Яна Бенядыкта Пратасевіча [3, s.172], не вядома ці пакінуў ён нашчадкаў.

Герб Івана Бакі сведчыць аб памылцы, якую зрабіў В.Каяловіч, прыпісаўшы род Бакаў да аднаго гербу з князямі Масальскімі [3, s.171]. К.Нясецкі ў сваім гербоўніку паўтарыў тое

ж самае [4, Т.2, s.43]. На самой жа справе Бакі карысталіся ўласнымі гербамі. Пра гэта сведчыць і герб Яна Бакі (сына Грыгора? [26, T.I, s.71]), падстаросты ўпіцкага з пячаткі 1581 г., якую змясцілі В.Вітыг і С.Дзядулевіч: *на тарчы клейнавы знак накшталт літары "М", з якой выходзіць доўгі і просты крыж, пад знакам шасціпраменная зорка* [10, s.23]. Ён сапраўды быў падобны на герб князёў Масальскіх, але адрозніваўся ад яго зоркай. Аднак, нельга выключыць магчымасці таго, што Бакі падганялі свой герб пад герб князёў Масальскіх, падкрэсліваючы агульнае з імі паходжанне з Севершчыны [26, T.I, s.70] і нават намякаючы на прыналежнасць да аднаго роду: "*baka Massalski herbu Massalskich*" [56, s.15].




**(24). Бжастоўскі Адам**, каштэлян полацкі,староста судовы ваўкавыскі, сакалоўскі і мсцібаўскі, кавалер ордэну Белага Арла, 1768.

**Герб**: на авальнай картушовай тарчы стрэмя, над тарчай шляхецкая карона, у кляйноцепяць пёраў стравуса ("Стрэмя"), вакол тарчы арматура з шабляў, дзідаў, штандараў, сцягоў, гарматаў і куляў, пад тарчай вісіць ордэн Белага Арла, надпіс у атоку: *"+ ADAM . BRZOSTOWSKI [KA]SZ[TELAN] POLOCKI . SADOWY . POWIATV . WOLKOWYSKIEGO . STAROSTA*".

Пячатка: адб., адв.пк, Ш 65 мм, д [9, ф.1664, воп.1, спр.188, а.8;спр.677, а.4 (1767); спр.596, а.48 (1769)].

Пячатка была прыкладзена да выпісу з кніг гродскіх Ваўкавыскага павета ад 20 мая 1768 г. з выракам справы паміж Янам Быхаўцам, маршалкам Ваўкавыскага павету і Крыстынай з Сапегаў Масальскай, падчашынай ВКЛ, а таксама з жыдамі Моселям Шломавічам, палонскім арандатарам і Шыманам Іцковічам, шчытненскім арандатарам па доўгу ў суме 33 600 злотых польскіх. Суд гродскі Ваўкавыскага павету ў складзе: ***Антоні Феліцыян Талочка***, падстароста, ***Ігнат Будкевіч***, ***Ануфры Дзяконьскі*** – суддзі, ***Антоні Сухадольскі***, пісар прысудзілі Яну Быхаўцу фальварак Палонск Ваўкавыскага павета, які належаў да Ражанскага графства Крыстыны з Сапегаў Масальскай, а таксама штраф і абвясцілі на яе і на жыдоў баніцыю.

Паводле В.Каяловіча, род Бжастоўскіх гербу "Стрэмя" паходзіў з Плоцкага ваяводства Польшчы (Мазовія) і першым у ВКЛ у канцы XVI ст. перасяліўся Крыштаф, які пакінуў дзвух сыноў: Яна і Лукаша [3, s.297]. Аднак, К.Нясецкі выводзіў іх з Кракаўскага ваяводства, а першым, паводле яго, з Саноцкай зямлі ў ВКЛ перанёсся сын Крыштафа – Ян Бжастоўскі, палкоўнік ЯКМ († 1638 г.) [4, Т.2, s.335]. З ім пагадзіўся А.Банецкі, які, тым не меньш, родавым гняздом Бжастоўскіх называе Бжастова ў Сандамірскім павеце [27, Т.2, s.191].

Род Бжастоўскіх у Ваўкавыскім павеце вядомы з XVIII ст. Адам Бжастоўскі паходзіў з лініі, якая ішла ад унука Цыпрыяна Паўла Янавіча († 1688 г.) – Канстанціна Бенядыкта (*1682 г., † 1722 г.), які быў яго бацькам. Маці яго была Тэрэса Война Ясянецкая, старасцянка браслаўская. Вучыўся Адам у Віленскім піярскім калегіюме. У 1741 г. ён згадваецца як падкаморы ЯКМ, староста даўгоўскі і пералайскі, у 1748 г. – генерал-маёр кавалерыі, а ў 1751 г. – генерал-лейценант інфантэрыі войскаў ВКЛ, у 1758 г. – маршалак Трыбуналу Галоўнага ВКЛ, каштэлян полацкі, староста мсцібаўскі, маладкоўскі, даўгоўскі і сакалоўскі, кавалер Ордэну Белага Арла. Паводле характарыстыкі С.Урускага, быў Адам "*prawości nieposzlakowanej, lecz charakteru slabego*". У 1763 г. ён, як камісар ЯКМ, супакойваў канфлікт паміж групоўкамі Чартарыйскіх і Радзівілаў, у 1764 г. належаў да т.зв. "*патрыятычнай*" партыі, у 1766 г. – староста сакалоўскі, здзітаўскі і мсцібаўскі. Ваўкавыскім судовым старостай

Адам Бжастоўскі быў у 1766–1773 г. [6, Кн.II, с.343: памылкова 1766–1779 г.]. У 1776 г. ён пакінуў пасаду полацкага каштэляна. З жонкай княжной Генавэфай Агінскай, ваявадзянкай троцкай, меў чатырох сыноў: Яна, Міхала, ***Аляксандра*** і Ксаверыя [26, T.II, s.37; 27, T.2, s.192; 45, T.I, s.27].



**(25). Бжастоўскі Аляксандр**, староста судовы ваўкавыскі і сакалоўскі, 1777.

**Герб**: на авальнай картушовай тарчы, у чырвоным полі (вертыкальная штрыхоўка) срэбнае стрэмя з маленькай куляй унутры, над тарчай графская карона з пяццю пэрлінамі, у кляйноце пяць пёраў страўса ("Стрэмя" зменены), вакол тарчы арматура з шабляў, шпадаў, дзідаў, штандараў, сцягоў, гарматаў, куляў і бубнаў, надпісу атоку: " *:ALEXANDER: BRZOSTOWSKI : SADOWY. WOLKOWYSKI° SOKOLO[WSKI]. STAROST[A]*".

Пячатка: адб. н/п, .55 мм, в [21, КП 9217, а.1; 9, ф.1664, воп.1, спр.451, а.1 (1774); спр.465, а.1, 12 ("*pod Pieczecia Grodzka Powiatu Wolkowyskiego*" 1775); спр.462, а.4 (1778)].

Пячатка была прыкладзена да выпісу з кніг гродскіх Ваўкавыскага павета ад 3 кастрычніка 1777 г. з рэляцыйным квітом генерала ЯКМ Гарадзенскага павета Якуба Кулікоўскага па справе Тадэвуша і Канстанцыі з Эйсымонтаў Сезянеўскіх з Янам Яскольдам, генералам ЯКМ ваўкавыскім і шляхтай ваколіцы Міткевічы таго ж Ваўкавыскага павета: Францішкам Сезянеўскім, Станіславам Ядкоўскім, Андрэям Тачыцкім, Юзафам бацькам і Юрыям сынам Сямашкамі.

Аляксандр Бжастоўскі, сын Адама і Генавэфы з князёў Агінскіх, ужо ў 1774 г. – староста ваўкавыскі і сакалоўскі, у 1776 г. – пасол на сойм, удзельнік чатырохгадовага сойму (1788–1792 г.), кавалер ордэнаў Святога Станіслава (1782 г.) і Белага Арла (1791 г.), у 1791–1795 г. – апошні каштэлян мазавецкі. Быў верным прыхільнікам караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай 5 чэрвеня 1798 г. разам з родным братам Ксаверыям атрымаў ад прускага караля Фрыдрыха Вільгельма III тытул графа і змены ў герб: *на авальнай тарчы з залатым краем у чырвоным полі срэбны трохкутнік, праз вяршыню і падставу якога прадзетыя два залатыя колцы, над тарчай графская карона, у кляйноце пяць пёраў страўса, на пастаменце – тарчатрымальнікі ў выглядзе двух волатаў з вянкамі на галавах і бёдрах, якія абапіраюцца на дубіны* [6, Кн.II, с.344; 26, T.II, s.38; 27, T.2, s.192; 45, T.I, s.33–34; 46, Ч.1, с.8]. Аднак, як вынікае з герба на пячатцы Аляксандра Бжастоўскага, графскую карону ён стаў выкарыстоўваць значна раней. Магчыма, гэта было выклікана тым, што яшчэ родны брат прапрадзеда Аляксандра – віленскі біскуп ксёндз Канстанцін Казімер Бжастоўскі († 1722 г.) атрымаў ад Папы Інакенція XI (1691–1700 г.) тытул графа "*państwa Rzymskiego*" ці "*św. państwa kościelnego*" [26, T.II, s.37; 47, s.15]. Такім чынам, Аляксандр Бжастоўскі карыстаўся гербам "Стрэмя" зменены. Класічны варыянт, паводле Б.Папроцкага, выглядаў так: *у чырвоным полі жоўтае стрэмя, у кляйноце пяць пёраў страўса* [1, s.298].

З жонкай Ганнай Вадзіньскай, падсталянкай ліўскай Аляксандр пакінуў сына Міхала [26, T.II, s.38; 27, T.2, s.193].

**(26). Будкевіч Ігнат**, суддзя гродскі і канюшы Ваўкавыскага павета, 1767.

**Гербы**: на правай авальнай тарчы месяц рагамі дагары, з шасціпраменнымі зоркамі на іх, паміж імі страла з пёрамі вастрыём уверх ("Сас" зменены); на левай таксама авальнай тарчы падкова канцамі ўніз, пад якую падкладзена булава навершам угору, да яе з левага боку тарчы нахілена наўскос дзвухрогавая харугва, над тарчамі шляхецкая карона, у



кляйноце тры пёры стравуса, прашытыя стралой, тарчы ляжаць на княжацкім плашчы.

Пячатка: адб. № 2, чрв/с, 15х16 мм, д [9, ф.1664, воп.1, спр.485, а.9 адв.].

19 снежня 1767 г. у Манцяках Ігнат Будкевіч, суддзя гродскі ваўкавыскі і ***Антоні Феліцыян Талочка***, падстароста судовы ваўкавыскі засведчылі "*Пункты для верыфікацыі за Дэкрэтам Гродскім Ваўкавыскім*" Уладзіслава Тадэвуша Аўсянага, вайсковіча ваўкавыскага па судовай справе супраць яго маці Схалястыкі з Ваньковічаў Аўсянай, войскай ваўкавыскай. Падпісаўся: "*JBudkiewicz SGrWolko*".

В.Каяловіч пра такі род не згадвае. К.Нясецкі ведаў Будкевічаў гербу "Траска" [4, Т.2, s.352]. З такім гербам выводзілі ў XVIII ст. сваё шляхецтва Буткевічы ў Віцебскім ваяводстве [51, s.13]. Да гэтага ж гербу прыпісалі і Ігната Будкевіча, суддзю гродскага і канюшага (1767 г.), пасля – суддзю земскага (1773–1778 г.) ваўкавыскага[1] [4, Т.2, s.352; 26, T.II, s.60; 27, Т.2, s.225]. Як бачым, памылкова. Ігнат карыстаўся гербам "Сас" з той адметнасцю, што страла ў кляйноце скіравана была ўправа, а не ўлева [37, s.139]. Побач змешчаны герб уласны невядомай яго жонкі. Княжацкі плашч наўрад ці сведчыў аб нейкіх прэтэнзіях на тытул, а быў, хутчэй за ўсё, праявай гербавага "*ліцьвінскага*" сепаратызму ў Рэчы Паспалітай [52, с.45].

Род Будкевічаў *vel* Буткевічаў паходзіў з Жамойці [27, Т.2, s.263]. У Ваўкавыскім павеце ён з'яўляецца ў першай палове XVII ст. – у 1621 г. на выправу ў Інфлянты разам з саўдзельнікамі ставіў каня па-казацку Войцех Буткевіч [42, с.48]. У 1655 г. склаў прысягу маскоўскаму цару: "*Якуб Балтромеев сын Буткеевичь*" [18, с.76]. У 1690 г. 3 дымы ў Ясколдаве Андрушкевічах меў Мікалай Буткевіч, 2 дымамі ў Пацуяве валодалі Юры і Аляксандр Буткевічы, па 1 дыму ў маёнтку Ясколдаў мелі Сыльвестар, Барталамей, Стэфан, Міхал Будкевічы і Францішак Буткевіч [19, s.195–196]. У XVIII ст. шматлікія Будкевічы займаюць у Ваўкавыскім павеце пасады лоўчых, мастаўнічых і будаўнічых [4, Т.2, s.352; 26, T.II, s.60; 27, Т.2, s.225].

Агульнае паходжанне Будкевічаў і Пуслоўскіх ад жамойцкага баярына Сурыята, а таксама тое, што Пуслоўскія карысталіся ўласным клейнавым гербам "Шаліга" зменены: "*miasto krzyża kladą dwa krzyże y strzalę z polowicą żelezca*" [3, s.306; 53, s.17], дазваляе меркаваць аб узнікненні "Саса" Ігната Будкевіча ў выніку паланізацыі яго родавага клейнавага герба. Тое ж датычыць і "Траскі" віцебскіх Буткевічаў. У выніку атрымалася, што розныя галіны аднаго роду карысталіся рознымі польскімі гербамі. У дадатак П.Малахоўскі згадваў яшчэ нейкіх Буткевічаў гербу "Ястрабец" [56, s.62].

**(27). Булгарын Павел**, канюшы і сурагатар гродскі Ваўкавыскага павета, 1763.

**Герб**: на авальным картушы меч вастрыём уніз, які прабіў два месяцы рагамі адзін да аднаго, над тарчай шляхецкая карона.

Пячатка: адб., адв.пк, 38х45 мм, к [9, ф.1664, воп.1, спр.817, а.2 ("*pod pieczęcią Grodzką Surrogatorską Wolkowyską*"), 4 адв. (1763)].

Герб Паўла Булгарына быў змешчаны на гродскай сурагатарскай пячатцы Ваўкавыскага павета, якая цалкам выглядала так: у цэнтры на авальнай тарчы літара "*M*", з якой выходзіць угору просты крыж, пад ёй тры ўрубы (герб "Масальскі" зменены), пад ім – герб канюшага і сурагатара, над тарчай верхняга герба – княжацкая мітра, абодва гербы ляжаць на княжацкім плашчы, надпіс у атоку захаваўся часткова: "** PIECZEC C GRODZKA*

.................................................................................................................................................

1. У вядомых нам крыніцах апошні раз Ігнат Будкевіч згадваецца 7 кастрычніка 1782 г., калі ён замяняў у ваўкавыскім земскім судзе пісара ***Міхала Булгарына*** [9, ф.1664, воп.1, спр.654, а.1 адв.].



... *POWIAT[U] [WOL]KOWYSKIEGO ... RV.1738.*”. Яна была прыкладзена да выпісу з ваўкавыскіх кніг гродскіх сурагатарскіх ад 30 красавіка 1763 г. з рэляцыйным квітом генерала ЯКМ Ваўкавыскага павета Юзафа Агільбы па справе Яна Быхаўца, ваўкавыскага земскага суддзіча з Міхалам з Канопніцаў Грабоўскім, шамбеланам ЯКМ і палкоўнікам Лейб Рэгіменту ЯКМ войскаў ВКЛ.

Род Булгарынаў гербу ўласнага паходзіў з Віцебскай зямлі – у 1511 г. згадваецца віцебскі баярын Юхно Булгарыновіч[2] [27, Т.2, s.249]. У Ваўкавыскім павеце – з канца XVII ст.: у 1690 г. Павел Булгарын, падчашы парнаўскі (ад 1685 г.), потым падчашы ваўкавыскі (1698 г.) валодаў застаўным маёнткам Сакольнікі ў 14 дымоў з млынам († пасля 1698 г.) [19, s.186].

Звесткі пра Паўла Булгарына, канюшага і сурагатара Ваўкавыскага павета сціплыя. Не вядома хто быў яго бацькам. Магчыма, згаданы вышэй падчашы парнаўскі. Сам ён у 1761 г. быў ваўкавыскім крайчым і паслом на сойм са Смаленскага ваяводства, а ў 1764 г. – каптуровым маршалкам і паслом на элекцыйны сойм з Інфлянцкага ваяводства [4, Т.10, Dodatek, s.58]. А.Банецкі ўдакладніў, што Павел у 1764 г. быў яшчэ і канюшым ваўкавыскім [27, Т.2, s.250]. Як бачым, апошнюю пасаду ён займаў ужо ў 1763 г. Звяртае ўвагу тое, што пячатка, вырабленая аж у 1738 г., была выкарыстана праз 25 гадоў. Больш таго, яна падобная на гродскую пячатку Ваўкавыскага павета з таго ж 1738 г., на якой замест герба П.Булгарына быў герб ***Уладзіслава Тадэвуша Быхаўца***, ваўкавыскага судовага падстаросты (гл. ніжэй). Выглядае на тое, што П.Булгарын таксама прэтэндаваў у тым годзе на гэтую пасаду. У 1759–1765 г. ён – рэгент скарбовы ВКЛ, пакінуў сына Яўхіма [26,Т. II, s.83; 27, Т.2, s.250].



**(27а). Ён жа**, маршалак каптуровы і канюшы Ваўкавыскага павета, рэгент скарбовы ВКЛ, 1764.

**Герб**: на раслінным картушы меч вастрыём уніз, які прабіў два месяцы рагамі адзін да аднаго, справа першыя дзве лічбы даты: “*17*”, злева маршалкоўская ляска злева направа наўскос, пад ёй апошнія дзве лічбы даты – “*64*”.

Пячатка: адб., пк, 56х65 мм, д [9, ф.1664, воп.1, спр.817, а.8 адв.; спр.546, а.1 адв. (“*pod pieczęcią Kaptur[owa] Wolkowyską*” 1764)].

Герб Паўла Булгарына быў змешчаны на каптуровай пячатцы Ваўкавыскага павета, якая цалкам выглядала так: у цэнтры на авальнай картушовай тарчы “Пагоня” пад княжацкай мітрай, пад ёй – герб каптуровага маршалка, картушы ляжаць на княжацкім плашчы, надпіс у атоку захаваўся часткова: “*+ [PAWE]L . BVLHARYN . MARSZALEK KAPTVROWY . Y KONIVSZY. PTTV. WOLKOW. REGET . S . WXL*”. Яна была прыкладзена да выпісу з кніг каптуровых Ваўкавыскага павета ад 10 сакавіка 1764 г. з рэляцыйным квітом генерала ЯКМ таго ж павета Юзафа Агільбы па справе Яна Быхаўца, суддзі гродскага ваўкавыскага з Міхалам Грыгорам з Канопніцаў Грабоўскім, шамбеланам і палкоўнікам Лейб Рэгіменту ЯКМ войскаў ВКЛ.

........................................................................................................................................

2. Н.Якавенка палічыла гэты род за валынскі (украінскі) [55, с.57]. Сапраўды, на Валыні на маёнтку Рамейкавічы ў 1543 і 1546 г. згадваюцца браты Стэфан і Грыгоры Раманавічы Булгарыны [27, Т.2, s.249], але з’явіліся яны там як перасяленцы з беларускіх зямель ВКЛ. У сваю чаргу, ў XVIII–XIX ст. у родзе існавалі тры версіі аб паходжанні: ад збеглага яшчэ ў XV ст. ад турак у ВКЛ балгарына ці булгарына (адсюль прозвішча), ад татараў, аселых у ВКЛ, і нават ад албанскага нацыянальнага героя Георгія Скандэрбега: “*niektórzy ... brali przydomek Skanderbek*” [26, Т.II, s.82]. Помнік беларускай перакладной літаратуры “*Аповесць пра Скандэрбега*” карыстаўся асаблівай папулярнасцю ў ВКЛ у другой палове XVI–пачатку XVII ст. [6, Т.1, с.139]. Магчыма, згаданая крыніца, а таксама імкненне растлумачыць сваё прозвішча, паслужылі Булгарынам для стварэння сваёй радаводнай легенды.



**(28). Булгарын Міхал**, пісар земскі Ваўкавыскага павета,1778.

**Герб**: на авальным картушы меч вастрыём уніз, які прабіў два месяцы рагамі адзін да аднаго, над тарчай княжацкая мітра.

Пячатка: адб.нп, .62 мм, д [21, КП 8732/7, а.1; 9, ф.1664, воп.1, спр.654, а.4 (1782); спр.79, а.4 (1785)].

Герб Міхала Булгарына быў змешчаны на ўрадавай земскай пячатцы Ваўкавыскага павета, якая цалкам выглядала так: у цэнтры герб "Пагоня" пад княжацкай мітрай, пад ёй герб земскага пісара, надпіс у атоку: *"+ PIECZENC : ZIEMSKA .:. POWIATV .:. WOLKOWYSKIEGO .:. R . 1 . 7 . 6 . 8 . MAIA : 6 . DNIA*" [9, ф.1664, воп.1, спр.79, а.4]. Яна была прыціснута да выпісу з кніг земскіх Ваўкавыскага павета ад 8 ліпеня 1778 г. з рэляцыйным квітом генерала ЯКМ Гарадзенскага павета Якуба Кулікоўскага па справе Тадэвуша і Канстанцыі з Эйсымонтаў Сезянеўскіх са шляхтай ваколіцы Міткевічы ў Ваўкавыскім павеце Станіславам Ядкоўскім, Андрэям Тачыцкім і Юрыям Сямашкам[3].

Дзедам Міхала быў Тамаш Булгарын, які ў 1697 г. падпісаў ад Наваградскага ваяводства элекцыю караля польскага і вялікага князя літоўскага Аўгуста II Саса. З жонкай Ганнай Ельскай Тамаш пакінуў сына Юзафа, які меў дзвух сыноў: Яна і згаданага Міхала [26, T.II, s.82; 27, T.2, s.250; 31, c.115].

Міхал Булгарын, пісар земскі ваўкавыскі (1766–1783 г.), дэпутат на Галоўны Трыбунал ВКЛ у Вільні (1766 г.), камісар да камісіі скарбовай ВКЛ (1777 г.), паўторна дэпутат на Трыбунал (1779 г.), пасол на сойм 1773–1775 г. і з яго – дэпутат на перамовах з Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй па I падзелу Рэчы Паспалітай, а таксама распарадчык фундушаў скасаванага Ордэну Езуітаў, "*dostal w nagrodę zaslug prawem emfiteutycznem*" Ялоўскае староства (1775 г.), сябра Сталай Рады пры каралі польскім і вялікім князі літоўскім Станіславе Аўгусце Панятоўскім (1775 г.), яго гарачы прыхільнік, ваўкавыскі пасол на чатырохгадовы сойм (1788 г.) [4, T.10, Dodatek, s.58; 26, T.II, s.82–83; 27, T.2, s.250]. З жонкай Казімерай Ельскай меў сыноў: Юзафа (у 1792– 1795 г. падстолія ваўкавыскага), Марціна, Станіслава і Калікста [4, T.10, Dodatek, s.58; 26, T.II, s.83; 31, c.115].

Уласны герб Булгарынаў А.Банецкі і С.Урускі называлі "Булат" і апісвалі так: *на тарчы з залатым краем, у блакітным полі меч з залатой рукаяццю вастрыём уніз, на ім два залатыя месяцы рагамі да сябе, над тарчай шляхецкая карона* [26, T.II, s.82; 27, T.2, s.249; 46, Ч.1, c.109]. У кляйноце павінны былі быць пёры стравуса, як у гербе Васіля Балгарына з пячаткі 1602 г. [5, c.96, № 237]. Міхал Булгарын ужываў у сваім гербе княжацкую мітру. Апошняя або сведчыла аб яго прэтэнзіях на тытул, або з'яўлялася праявай гербавага "*ліцьвінскага*" сепаратызму [52, c.45]. Дата на земскай ваўкавыскай пячатцы сведчыла аб часе яе вырабу.

..............................................................................................................................................

3. Род жамойцкага паходжання гербу "*Лебедзь*". З валынскімі Сямашкамі іх звязвала толькі прозвішча [57, c.32]. Уласны герб Булгарынаў А.Банецкі і С.Урускі называлі "Булат" і апісвалі так: *на тарчы з залатым краем, у блакітным полі меч з залатой рукаяццю вастрыём уніз, на ім два залатыя месяцы рагамі да сябе, над тарчай шляхецкая карона* [26, T.II, s.82; 27, T.2, s.249; 46, Ч.1, c.109]. У кляйноце павінны былі быць пёры стравуса, як у гербе Васіля Балгарына з пячаткі 1602 г. [5,c.96, № 237]. Міхал Булгарын ужываў у сваім гербе княжацкую мітру. Апошняя або сведчыла аб яго прэтэнзіях на тытул, або з'яўлялася праявай гербавага "*ліцьвінскага*" сепаратызму [52, c.45]. Дата на земскай ваўкавыскай пячатцы сведчыла аб часе яе вырабу.

***Літаратура і крыніцы:***


1. Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego 1584.– Kraków, 1858.– 964 s.
2. Okolski S. Orbis Polonus.– Cracoviae, 1640–1645.– T.1–3.
3. Kojałowicz Wijuk W. Herbarz rycerstwa W.X.Litewskiego tak zwany Compendium.– Kraków, 1897.– 527 s.
4. Niesiecki K. Herbarz polski.– Lipsk, 1839–1846.– T.1–10.
5. Цітоў А. Пячаткі старажытнай Беларусі: Нарысы сфрагістыкі.– Мн.: Полымя, 1993.– 239 с.

6. ЭГБ.– Мн.: БелЭн, 1993–2003.– Т.1–6.
7. Любавский М. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства... М., 1892.
8. Biblioteka Narodowa w Warszawie, Rps. BN III, 9100.
9. НГАБу Горадні.
10. Wittyg W., Dziadulewicz S. Nieznana szlachta polska i jej herby.– Kraków, 1908.– 436 s.
11. Rachuba A. W sprawie nieznanych Wittygowi nazwisk i herbów szlacheckich.// Heraldyka i okolice./ Red. A.Rachuba, S.Górzyński, H.Manikowska.– Warszawa, 2002.– S.143–154.
12. Puzyna J. Niektóre pieczęcie litewskie z XVI i XVII w.// Magazyn heraldyczny.– Warszawa, 1933.– R.XII.– Nr4.– S.55–58
13. Akta Unii Polski z Litwą 1385–1791 / Wyd. S.Kutrzeba, W.Semkowicz.– Kraków, 1932.– 570s.
14. Шаланда А. Гербы і род Адамовічаў у другой палове XVI–XVII ст.// Наш радавод.– Горадня, 1996.– Кн.7.– С.187.
15. Шаланда А. Удакладненні да гербу і радаводу Аляхновічаў.// Ваўкавышчына: з гісторыі краю... Ваўкавыск, 1997.
16. Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кн.523. Кн. Публічных спраў 1./ Падрыхт. А.Груша, М.Спірыдонаў, М.Вайтовіч.– Мн.: Бел. навука, 2003.– 444 с.
17. РИБ.– Пгд, 1915.– Т.33.– 1378 с.
18. Крестоприводная книга шляхты Великого княжества Литовского 1655 г.: Памятники истории Восточной Европы: Источники XV–XVII вв./ Сост. Е.Е.Лыкова, М.Кулецкий.– М.: Древлехранилище, 1999.– Т.IV.– 264 с.
19. Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo nowogródzkie 1690 r./Oprac. H.Lulewicz, A.Rachuba.– Warszawa, 2002.– 290 s.
20. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) ў Менску.
21. ГДГАМ.
22. Bouffall B. Olędzcy herbu Rawicz.// Zychlinski T. Zlota księga szlachty polskiej.– Poznań, 1891.– R.XIII.– S.247–267.
23. Пластыка Беларусі XII–XVIII ст.– Мн.: Беларусь, 1983.– 231 с.
24. Zychliński T. Zlota księga szlachty polskiej.– Poznań, 1891.– R.XIII.– 405 s.
25. Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku.– Warszawa, 1895.– 698 s.
26. Uruski S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej.– Warszawa, 1904–1931.– T.I–XV.
27. Boniecki A. Herbarz Polski.– Warszawa, 1899–1913.– T.1–16.
28. Зимин А.А. Формирование боярской аристократии в России во второй половине XV–первой трети XVI в.– М.: Наука, 1988.– 350 с.
29. Шаланда А., Фёдараў І. Палацава-паркавы комплекс увёсцы Ябланова і яго ўладальнікі ўканцы XVIII–пачатку XIX ст.// Сядзібы і паркі Гродзеншчыны.– Гродна, 2004.– Ч.II.– С.54–58.
30. Окуневский Г.А. Родословная князей Огинских в Волковысском повете.// Ваўкавышчына: з гісторыі краю і лёсу людзей.– Ваўкавыск, 1997.– С.78–82.
31. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Ваўкавыскага раёна.– Мн.: БЕЛТА, 2004.– 528 с.
32. АВАК.– Вильно, 1865–1915.– Т.1–39.
33. Lietuvos Metrika (1528–1547).– Vilnius, 1995.– Kn.6.– 488 s.
34. Semkowicz W. O litewskich rodach bojarskich zbratanych ze szlachtą polska w Horodle roku 1413.// LSP.– Poznań, 1989.– Studia Historica III.– S.7–139.
35. Gumowski M. Pieczęcie królów polskich.– Kraków, 1910.– 94 s.
36. БР КГДГАМ, № 01929/3: Paszkiewicz M. Sladybez zawady JWJP.Krystyny z Abramowiczyw Oginskiey...– Wilno, 1739.
37. Górzyński S., Kochanowski J. Herby szlachty polskiej.– Warszawa, 1992.– 175 s.
38. АЮЗР.– СПб., 1865.– Т.2.– 287 с.
39. Boniecki A. Poczet rodów w Wielkim Księstwie Litewskiem w XV i XVI wieku.– Warszawa, 1887.– 425 s.
40. Гербоўнік беларускай шляхты./ Т.Капіца, А.Леўчык, С.Рыбчонак і інш.– Мн.: БелНДІДАС, 2002.– Т.1.– 493 с.
41. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. Ziemia Smoleńska i województwo Smolenskie XIV–XVIII wiek./ Pod red. A.Rachuby. Oprac. H.Lulewicz, A.Rachuba, P.Romaniuk.– Warszawa, 2003.– T.IV.– 412 s.103
42. Семянчук Г. Попіс шляхты Ваўкавыскага павета 1621 г.// Герольд Litherland.– Горадня, 2004.– № 1–2.– С.44–51.
43. Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст.– Мн.: Навука і тэхніка, 1983.– 175 с.
44. Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskigo. Województwo wileńskie 1690 r./ Opr. A.Rachuba.– Warszawa, 1989.– 372 s.
45. Kossakowski S.K. Monografie histiryczno-genealogiczne niektórych rodzin polskich.– Warszawa, 1859–1872.– T.I–III.
46. Гербовник дворянских родов Царства Польского.../ Сост. Н.И.Павлищев.– Варшава, 1853.– Ч.1–2.
47. Zychliński T. Złota księga szlachty polskiej.– Poznań, 1881.– R.III.– 380 s.
48. Urzednicy centralni i dostojnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku. Spisy./Oprac. H.Lulewicz, A.Rachuba.– Kórnik, 1994.– 255 s.
49. Urzednicy Wielkiego Ksiestwa Litewskiego. Spisy. Wojewydztwo Wileńskie XIV–XVIII wiek./ Pod red. A.Rachuby. Oprac. H.Lulewicz, A.Rachuba, P.Romaniuk.– Warszawa, 2004.– T.I.– 764 s.
51. Herbarz szlachty prowincyi Witebskiej./Wyd. F.Piekosiński.– Kraków, 1899.– 228s.
52. Шаланда А. Гербавы “*сепаратызм*” шляхты ВКЛ у 2 палове XVII–XVIII ст.// Шляхда ўзаемнасці=Droga ku wzajemnosci. Мат. X Міжнар. навук. канф.: Гродна–Мір, 24 кастрычніка 2002 г./ ГАУПП “*Гродз. друк.*”, 2004.– С.41–47.
53. Pamiętnik [1640–1684]. Jan Wladyslaw Poczobut Odlanicki / Opr. A.Rachuba.– Warszawa, 1987.– 430 s.
54. Kamieński A. Kariera rodu Siemaszków w XV–XVII wieku.// LSP.– Poznań, 1989.– Studia Historica III.– S.179–202.
55. Яковенко Н.М. Українська шляхта. З кінця XIV до середини XVII ст.– Київ, 1993.– 412 с.
56. Malachowski P. Zbiyr nazwisk szlachty z opisem herbów własnych familiom zostaiącymw Królestwie Polskim i Wielkim Księstwie Litewskim– Lublin, 1805.– 817 s.
57. Амелька С. Шляхецкі род Сямашкаў герба “*Лебедзь*”: рассяленне, паходжанне і гістарычна-культурнае значэнне ў XVI–XIX ст// Герольд Litherland.– Горадня, 2001.– №1.– С.27–34

***(працяг будзе).***

# Гадавая справаздача па гораду Ваўкавыску за 1845год

***Мікалай Быхаўцаў***

Заўжды чалавека цікавяць лічбы, якія распавядаюць аб даўнейшым жыцці іх продкаў. Але не шмат такіх лічб захаваліся ў архіўных справах, асабліва што тычыцца 18 ст. і яшчэ ранейшага часу. С пачатку 19 ст. у губернскі горад Гродна з паветаў мясцовая ўлада пачала пасылаць штогагадовыя справаздачы. Аднак яны былі вельмі сціслыя і ўкладваліся ў некалькі асноўных лічбаў: колькасць насельніцтва, будынкаў і г. д. Так, за 1825 г. паведамлялася, што ў горадзе Ваўкавыску налічваецца: царквоў – 1, дамоў мураваных – 3, драўляных – 190; жыхароў абодвага полу: духоўных – 3, дваран – 69, ваеннаслужачых – 157, мяшчан і яўрэяў – 1487, дваровых – 42, усіх астатніх саслоўяў – 68, усяго – 490 муж. і 886 жан; арыштантаў у гарадской турме – 11 муж. і 2 жан.; богаўгодных мест – 2; фабрык – 1; спраў паліцыі за год – 792 [1, с.53адв.-54].

Адной з першых падрабязных справаздач па Ваўкавыску, якая выявілася ў Гродзенскім Гістарычным архіве, з”явілася справаздача за 1845 г. З каментарыямі даследчыка Мікалая Быхаўцава яна і прыводзіцца ніжэй [2,с.117-127адв]:

***1.Звесткі тапаграфічныя.*** Горад Ваўкавыск знаходзіцца пры рацэ Ваўкавыя, якая цячэ каналам не болей адной сажані ў шырыню. Жыхары горада карыстаюцца вадой часткай з ракі, часткай з калодзежаў, якія знаходзяцца пры дамах колькасцю 15 штук. У 1845 г. рака адкрылася 27 сакавіка ў 3 гадзіны папалудні, а стала 18 снежаня ў 3 гадзіны папалудні.

У горадзе знаходзіцца:

Мастоў: каменных – 1, драўляных – 4. Вуліці перавулкаў – 8, з іх машчоных каменнем – 6, не машчоных – 2. Плошч немашчоных – 1.

Садоў, якія належаць прыватным асобам – 3. Агульная плошча іх складае не болей 3 дзесяціны. Уладальнікі садоў прыбытка з іх не атрымліваюць і толькі карыстаюцца пладамі самі.

Агародаў – 50. Пустых плацаў, якія маюцца забудавацца – 3.

Могілак – 3 (праваслаўныя, каталіцкія і яўрэйскія).

***2. Будынкі.***

Колькасць царквоў: праваслаўная, пабудаваная дзеля кварціруючых у горадзе войск, – адна, драўляная; “иностранных исповеданий” – адна драўляная (маецца на ўвазе каталіцкі касцел. Па логіке выходзіць, што раз каталіцкі касцел лічыцца іншаземным, то і самі каталікі іншаземцы. Вось як хутка царскія чыноўнікі, якія акупавалі гэты край, пачалі лічыць людзей, якія жылі тут з даўніх часоў, іншаземцамі. – М.Б.); сінагога драўляная – 1 і 5 яўрэйскіх драўляных школ; малітвенных драўляных школ – 5 (маецца на ўвазе пратэстанскіх, езуіцкіх і іншых малітвенных дамоў. – М.Б.).

Будынкаў, належачых ураду: 2 мураваных і 7 драўляных.

Будынкаў, належачых каталіцкаму касцелу, – 5 драўляных.

Будынкаў, належачых дваранам і чыноўнікам, – 1 мураваны і 29 драўляных.

Будынкаў, належачых купцам, – 1 мураваны і 6 драўляных.

Будынкаў, належачых мяшчанам, – 302 драўляных.

Будынкаў, належачых мяшчанкам, – 80 драўляных.

Будынкаў, належачых салдатам, – 21 драўляны.

Будынкаў, належачых сялянам, – 3 драўляных.

З ліку гэтых будынкаў пражываюць: ад 5 да 10 жыхароў – 300 будынкаў, ад 10 да 15 жыхароў – 74 будынкі, ад 15 да 20 жыхароў – 46 будынкаў, ад 20 да 25 жыхароў – 33 будынкі.

У 1845 г. пачата будаўніцтва драўляных дамоў: 1 прыватны , закончана будаўніцтва 1 дома. Гэты новапабудаваны будынак не можа звяртаць на сябе ўвагі, бо пабудаваны ў два паверхі.

У 1845 г. у Ваўкавыску 29 мая здарыўся адзін пажар у 1-й гадзіне па палудні і працягваўся да 3-х гадзін. Згарэла 5 мяшчанскіх драўляных дамоў, сарай і клуня. Прычына пажару не знойдзена. Гаспадары панеслі страты на 800 рублеў срэбрам.

Было застрахована ў 2-м страхавым вобшчастве: адзін драўляны дом на 640 рублеў.

***3. Народанасельніцтва.***

Духавенства: палкавы святар і яго жонка, белага духавенства (г. зн. не манахі. - М.Б.): каталіцкіх ксяндзоў – 3, царкоўнаслужыцеляў – 5 муж. і 3 жан. (тут і далей маецца на ўвазе члены сям'і. – М.Б.);

благародных ваеннага ведамства: генералаў – няма, штабс-афіцэраў – 4 муж. і 3 жан; обер-афіцэраў – 20 муж. і 4 жан.;

благародных грамадзянскага ведамства: ад 5 класа і вышэй, штабс-афіцэраў – 4 муж. і 2 жан.; обер-афіцэраў – 30 муж. і 17 жан.; не маючых 14 класа – 22 муж. і 4 жан.

(Колькасць іншых жыхароў, а таксама агульная лічба насельніцтва горада чамусьці адсутнічае. З іншай крыніцы можна даведацца, што колькасць насельніцтва ў горадзе Ваўкавыску ў 1848 г. склала: 2150 муж. і 1147 жан., усяго – 3297. Прыблізна такі расклад насельніцтва мог быць і ў 1845 г. Значнае перабольшванне мужчын над жанчынамі тлумачыцца пастоем ніжніх воінскіх чыноў і іх жонак, якіх разам налічвалася 948 чалавек [3,с.288]. – М.Б.)

Колькасць памерлых: 138 муж. і 85 жан., усяго – 223 (у дакуменце колькасць памерлых даецца нават па месяцах, але тут не прыводзіцца. – М.Б.). З іх памерла ў прыватных дамах – 101 муж. і 78 жан., усяго – 179; у багадзельні – 37 муж. і 7 жан., усяго – 44.

Галоўная хвароба, ад якой памерлі людзі, была нервовая гарачка. Прычына яе хучэй за ўсе ад неўраджаю і ў сувязі з гэтым – голаду, а таксама моцная прастуда. Усе гэта асабліва закранула бяднейшых жыхароў. Хутка памерлых жыхароў – 1, які памер ад апаплексіі. Нясчастных смярцей і выпадкаў не было. Гвалтоўных выпадкаў смерці было ў 1 муж. і 1 жан., а менавіта яны былі замардаваны. Прычына замардаванняў не знойдзена. Самагубстваў зафіксаваны адзін выпадак, а менавіта мужчына ўдушыўся. Прычына самагубства – беднасць і худыя паводзіны, а таксама баязнь адказнасці за крадзеж.

***4. Спажыванне.***

На ўласнае харчаванне жыхароў забіта: быкоў і кароў – 799, бараноў – 1200, цялят – 713. Лічачы сярэднюю вагу быка 6 пудоў 16 фунтаў, барана – 1 пуд 10 фунтаў, цяля – 1 пуд, то спажывана: гавядзіны – 5093 пуды 25 фунтаў, бараніны – 1500 пудоў, цяляціны – 713 пудоў, усяго – 7306 пудоў 25 фунтаў. Звер х таго, зімою з акалічных месц у горад прывозіцца мерзлая свініна і саланіна, прыблізна да 70 пудоў на год. Свежай рыбы жыхарамі ўжываецца не вельмі многа па прычыне недастатка ў ей, бо лоўля яе ў рацэ Ваўкавыі не робіцца і ў малой колькасці дастаўляецца з Пінскага павета, дзе больш за ўсе ловіцца ў рацэ Піне.

(Можна падлічыць ў сярэднім спажыванне мяса жыхарамі горада. Так, на 3297 жыхароў у год спажывалася 7376 пудоў рознага мяса. З гэтага выходзіць, што сярэдня ў год кожны жыхар з'ядаў каля 36 кілаграмаў мяса, або каля 100 грамаў на дзень. І гэта не ўлічваючы мяса дамовых птушак і дзікіх жывел. Калі яшчэ не ўлічваць посныя дні, калі мяса не спажывалі, то спажыванне мяса было на высокім узроўні. - М.Б.)

Хлеба ў горад па прыблізных разліках было прывезена: мукі аржаной – 6000 кулеў, пшанічнай – 100 кулеў, жыта – 2000 чацвярцей, пшаніцы – 90 чацварцей, аўса – 600 чацварцей, ячменя – 80 чацвярцей, круп розных – 100 чацварцей. З ніх 100 чацвярцей жыта ўжывана падрадчыкамі на выраб харчавання ў ваўкавыскі харчавы магазін.

Віна хлебнага (маецца на ўвазе гарэлка. – М.Б.), гарэлкі і спірту завезена ў горад 8000 вядзер. Наогул, спажыванне віна ў Ваўкавыску, можна меркаваць, было да 7000 вядзер. Найбольшая колькасць ужывана ў студзені, сакавіку, красавіку і снежні па прычыне таго, што ў гэты час бываюць галоўныя святы. Астатняя колькасць вырабляемай гарэлкі вывозіцца ў суседнія з Ваўкавыскам паветы.

Дроў, па прыкладным падліку, сухой дарогай прывезена да 25000 вазоў. Лічачы, што ў сажань дроў уваходзіць 12 вазоў, то ўсяго прывезена 2083 сажані і 4 вазы. Дровы большай часткай дастаўляюцца з лясоў Ваўкавыскага павета памешчыцкімі сялянамі. Тут яшчэ даволі многа лясоў, якія прадаюцца памешчыкамі на сруб. Большай часткай гэта сасновыя і бярозавыя дрэвы.

Сярэднія гандлевыя цэны на жыццевыя прыпасы: куль аржаной мукі вагай 9 пудоў – 6 руб. 75 кап., пшанічнай мукі – 12 руб. 41 кап., чвэрць грэчневай крупы – 11 руб. 84 кап., чвэрць аўса – 2 руб. 30 кап., пуд гавядзіны – 1 руб. 28 кап., пуд сена – 23 кап., сажань бярозавых аднапаленных дроў – 4 руб. 1 кап. Прычым, у залежнасці ад месяца цэны мяняліся. Так, куль ржаной мукі каштаваў 5 руб. 40 кап., у жніўні - 6 руб. 30 кап., верасні – 8 руб. 10 кап., кастрычніку – 9 руб., лістападзе – 10 руб., снежні – 9 руб. На гавядзіну за цэлы год цана стабільная. Пуд сена танней каштаваў у жніўні і верасні – 17 кап. Бярозавыя дровы ў летнія месяцы – 3 руб. 50 кап., крупы ў верасні 16 руб., зімою – 9 руб. 60 кап. У 1845 г. харчаванне жыхароў Ваўкавыска сустрэла вялікую перашкоду і павышэнне цэн з выпадку неўраджаю.

***5. Гандаль.***

За 1845 г. было абвешчана купецкіх капіталаў: 1-й гільдыі – няма, 2-й гільдыі – няма, 3-й гільдыі – 6855 рублеў. Галоўны занятак мясцовых купцоў – гэта гандаль сукном, якое выпрабляецца на мясцовай суконнай фабрыцы, і продаж чырвоных тавараў (тавар для паноў або заможных людзей. – М.Б.), якія атрымліваюць ад маскоўскіх купцоў. Сукно з асаблівымі выгодамі для прадаўцоў прадаецца ў іншых губернiях, а чырвоны тавар – у горадзе. Найбольш гэтым гандлем займаецца купец яўрэй Янкель Шмуйла Невеловіч-Пінес, абароты якога, як гавораць, даходзяць да 15000 рублеў срэбрам.

У горадзе Ваўкавыску ярмаркі ніколі не бываюць. Лавак жа – 57, у тым ліку: з чырвоным таварам – 8, хлебных – 8, маскацельных – 5 (красільныя і розныя аптэчныя прыпасы, ужываныя ў рамясле, фабрычных і прамысловых прадпрыемствах. – М.Б.), мелачных – 22, скураных – 4, саляных – 10, тракціраў і гасцініц – 2, піцейных дамоў – 68.

***6. Прамысловасць.***

Фабрык і заводаў – 4. У тым ліку: прыватная суконная фабрыка – 1 з 35 работнікамі, скураных заводаў – 1 з 8 работнікамі, цагляных заводаў – 2 з 8 работнікамі. На суконнай фабрыцы ўжываецца авеча воўна, якая купляецца ў памешчыкаў мясцовага павета. На працягу 1845 г. у яе рабоце быў невялікі перапынак у сувязі з павышэннем цэн на воўну.

***7. Рамествы.***

У горадзе налічваецца: краўцоў – 18, сапожнікаў – 10, кавалеў – 4, алавяншчыкаў – 2, слесараў – 1, токараў – 1, пераплетчыкаў – 5, маляроў – 2, плотнікаў – 4, гадзін нікавых майстроў – 3.

***8. Грашовы курс.***

У гандлі пры абмене грошай быў пастаянны курс: 1 рубель срэбрам каштаваў 3 руб. 50 кап. меддзю. Іншаземнай манеты (польскай у 5, 2, 1 злотых і 10 і 5 грошаў з нізкай пробай срэбра і медных 3 і 1 грошы) тут дастаткова. Другіх грошай у горадзе зусім не было.

***9. Агульныя заўвагі аб дабрабыце жыхароў.***

Галоўны занятак мясцовых мяшчан хрысціян – земляробства і гаспадарка, а яўрэі, якіх тут у два разы больш, займаюцца больш за ўсе гандлем, падрадам і продажжу па дамах гарачага віна (гарэлка, сівуха і т. д. – М.Б.) і піва.

***10. Гаспадарка горада.***

Горад атрымаў гарадскога прыбытку 2975 руб. 46 кап. срэбрам. Звярх таго, ад мінулых гадоў застаўся капітал у суме 244 руб. 21 кап.

Галоўныя стацці даходу ў 1845 г.:

З забудаванай жыхарамі зямлі чынша – 66 руб. 75 кап.;

З купцоў адна чвэрць збора – 22 руб. 85 кап.

Галоўныя стацці расхода:

На ўтрыманне паліцыі – 153 руб. 50 кап.;

На ўтрыманне магістрата – 493 руб. 62 кап.;

На ўтрыманне турмы – 49 руб. 57 кап.

На ачышчэнне гарадской плошчы – 33 руб.

На пажарныя інструманты – 35 руб.

***11. Грамадскіе ўстановы.***

Прыходскае вучылішча, якое ўтрымліваецца за казенны кошт. У ім 2 настаўніка і 3 вучні з мужчын.

Дабрачынныя установы:

Гарадскі шпіталь, які падпарадкоўваецца гродзенскаму Прыказу грамадскага прызрэння. Колькасць чыноўнікаў у ім – 5, служачых – 2, было апекована – 241 чалавек, з якіх памерла – 31.

Яўрэйская багадзельня: служачых – 2, было апекована – 157 чалавек, памерла – 9.

Папраўчая гарадская турма: знаходзілася 98 муж. і 6 жан., выпушчана – 76 муж. і 6 жан., памерлі – 1 муж., засталося на 1846 г. – 21 муж.

З тых, хто знаходзіўся ў турме, было: судзімых за забойства – 1 муж., за рабунак – 1, крадзеж і машэнства – 53 муж. і 3 жан., за пасягацельства на ўласнае жыцце – 1 муж., святятатства – 3 муж., падпал – 1, ухіленне ад рэкрутаў – няма, бадяжніцтва – 38 муж. і 3 жан.

З усіх сядзельцаў з горада было ўсяго 10 чалавек. Для харчавання арыштантаў дабраахвотных прынашэнняў ніякіх не было, акрамя збора з кружкі, якая стаяла пры дзвярах астрога. На працягу года ў яе трапіла не болей 75 кап. срэбрам.

***12. Дзейнасць паліцыі.***

Адшукана павінных у крадзяжы – 3 муж. і 1 жан., якія скралі на суму 116 руб. срэбрам. Усіх крадзяжаў у горадзе было 6 на суму 144 руб, з іх буйнейшымі былі:

1. У дваравіна Гродзенскага павета ваколіцы Бурнева – Эйсымонта украдзена 2 валы на суму 36 рублеў.

2. У селяніна мястэчка Воўпа Аляксандра Мураўскага ўкрадзена кабыліца на суму 35 руб. срэбрам.

Знойдзена павінных у разбоі – 3 муж., узята за крадзеж – 3 муж. і 1 жан.

За п'янства ўзята – 13 муж. і 6 жан.

За адсутнасць пісьмовага віда на жыхарства – 3 муж. і 3 жан.

Найбольш было ўзята паліцыяй за п'янства сялян, якія прыязджалі на торг з павета, а за крадзеж – сялян і яўрэяў. Пад наглядам паліцыі ў 1845 г. людзей не састаяла.

Гарадскімі лекарамі на працягу года: ускрыта мертвых цел – 2 муж. і 1 жан., праізведзена пасведчанняў аб пабоях, якія былі нанесены ў бойцы, – 2 муж. і 3 жан.

Колькасць спраў: крымінальных – 4, следственных – 47.

17 верасня ў горадзе Ваўкавыску на Паштовай вуліцы знойдзена забітай сялянка Караліна Сцефановічава. Па гарачых слядах адшуканы віноўныя: радавыя Ніжагародскага пяхотнага палка Петр Грабарчык, Іван Карсакоў і Іосіф Станішэўскі.

***Крыніцы:***


1. НГАБ (Нацыянальны Гістарычны архіў Беларусі) у Гродне. Ф.1. Воп.2, Сп.915.
2. НГАБ. Ф.1. Воп.20. Сп.1457.
3. НГАБ. Ф.1. Воп.21. Сп.651

# Постановления Волковыской городской Думы за 1891 г.

***Николай Быховцев***

